УДК 75(091)

**М.Л. Цыбульскі**

# З гісторыі мастацкай адукацыі: педагагічная спадчына М.Фешына

Лёс падзяліў жыццё неперавзыйдзенага майстра малюнку і жывапісу Мікалая Фешына паміж двума вялікімі народамі – рускім і амерыканскім. Аднак на Радзіме, у Расіі, пасля эміграцыі мастака ў 1923 годзе яго імя было амаль на паўстагоддзя выкрэслена з гісторыі развіцця мастацтва. У той час, калі ў Амерыцы аб М.Фешыне пісалі, выдавалі альбомы з рэпрадукцыямі яго графічных і жывапісных твораў, у Савецкай краіне, нават буйнейшыя энцыклапедыі нярэдка ўпарта замоўчвалі імя яркага і адоранага мастака. І толькі некалькі даволі сціплых для выдатнейшага рысавальшчыка і жывапісца, майстра такога высокага узроўню, выданняў, з'явіўшыхся ў 70-80-я гады далі магчымасць пазнаёміцца з яго творчасцю [1]. Але практычна не даследаванай засталася педагагічная дзейнасць М.Фешына. Нават у адным з асноўных даследаванняў па гісторыі мастацкай адукацыі ў Расіі аўтар прыгадвае М.Фешына ўсяго толькі як таленавітага вучня І.Рэпіна, ніводным словам не ўспамінаючы аб яго педагагічным вопыце [2]. У пэўнай ступені, адсутнасць грунтоўных даследаванняў педагагічнай спадчыны мастака абумоўлена і тым, што Фешын, як і Рэпін з'яўляўся па сутнасці педагогам-практыкам і працэс

навучання ніколі не захапляў яго цалкам. Гэтым тлумачыцца і амаль поўная адсутнасць запісаў аб поглядах мастака на прынцыпы мастацкай адукацыі. Таму асноўнымі крыніцамі для знаёмства з педагагічнай дзейнасцю М.Фешына паслужылі перапіска мастака з сябрамі, роднымі, успаміны яго вучняў, сведчанні сучаснікаў, калег па працы і іншыя архіўныя матэрыялы.

З Казанскай мастацкай школай, якая пачынаючы з канца XIX стагоддзя рыхтавала выкладчыкаў для гарадскіх вучылішч і мастакоў-дэкаратараў, і ў якой пазней выразна раскрыліся здольнасці М.Фешына як педагога па мастацтву, звязана большая частка яго жыцця ў Расіі. У гэтую навучальную ўстанову будучы мастак паступіў вучыцца ў 1895 годзе, а пасля паспяховага яе завяршэння, як лепшы вучань быў рэкамендаваны для паступлення ў Вышэйшую мастацкую вучэльню пры Акадэміі мастацтваў. Упартасць, вялікая працавітасць і, безумоўна, прыродная адоранасць дазваляюць Фешыну за адзін год прайсці праз усе класы і ў красавіку 1902 г. перайсці ў майстэрню І.Рэпіна. Менавіта ў час вучобы там Фешын упершыню сутыкнуўся з педагагічнай дзейнасцю. Прыехаўшы на пленэр у Мстэры Уладзімірскай губерні ён часта прыходзіў у іканапісную школу, якой загадваў мастак К.Еўлампіеў. Там М.Фешын вучыў будучых іканапісцаў малюнку, паказваў этапы працы над ім, асаблівасці пабудовы формы, адвучаў ад бессэнсоўнага перамалёўвання і бездапаможнай тушоўкі [3]. А ў час падрыхтоўкі конкурснай працы па заканчэнні Акадэміі, якую М.Фешын вырашыў пісаць у Казані, ён адначасова кіраваў натурным класам жывапісу і малюнку ў Казанскай мастацкай школе. За выдатныя пазнанні ў жывапісе і навуковых прадметах, прадэманстраваныя М.Фешыным у вучылішчы, ён быў не толькі ўдастоены звання мастака, права выкладання малявання ў вучэбных установах, але і ўзнагароджаны пенсіянерскай паездкай па Францыі, Італіі і Германіі.

Пасля вяртання з Еўропы ў 1909 годзе М.Фешын пачынае выкладаць у Казанскай мастацкай школе. Побач з М.Фешыным сюды прыязджаюць выпускнікі Акадэміі мастацтваў П.Бенькоў і П.Еўстаф'еў. З'яўленне маладых выкладчыкаў прыцягвае ўвагу навучэнцаў. "Уся Казанская школа ў гэты перыяд была па сутнасці фешынскай (...), вучні пераймалі яго манеру і шчыра прызнавалі, што ён быў самы таленавіты з мастакоў выкладчыкаў" [4]. Адбываюцца змены ў выкладанні асноў малюнка, тэхнікі і тэхналогіі жывапісу. "Ёсць поўнае падабенства з тым, што ўвёў Фешын у Казанскай школе ў галіне ўсведамлення жывапісу і малюнка, з тым, што зрабіў В.Сяроў у час яго прыходу ў якасці педагога ў Маскоўскую школу жывапісу, ваяння і дойлідства" [5].

У Казанскай мастацкай школе Мікалай Фешын кіраваў натурным класам па малюнку, фігурным і натурным класам па жывапісу. Перад тым, як трапіць у клас нацюрморта да М.Фешына, вучні праходзілі праз малодшыя класы, дзе выкладалі архітэктары, якія ў асноўным абмяжоўвалі свае патрабаванні дакладным капіраваннем гіпсавых мадэляў. Фешын меў больш шырокія погляды на задачы школы і ў першую чаргу быў цвёрда ўпэўнены ў тым, што школа павінна даць вучням дастатковы аб'ём мастацкіх ведаў, незалежна ад іх схільнасцей. Мастак быў перакананы, што падобная ўстаноўка ніяк не паўплывае на сапраўдны талент і тым больш не згубіць яго. Разам з тым, Мікалай Фешын больш любіў працаваць са здольнымі вучнямі, якіх у яго майстэрні было нямала. Ён патрабаваў ад іх дасканалага вывучэння рамяства, тактоўна накіроўваў іх намаганні і ніколі не перашкаджаў. Што датычыцца пачынаючых, то Фешын некаторы час прыглядаўся і толькі калі заўважаў у працах навучэнцаў "іскру" пачынаў сур'ёзна працаваць з імі [6]. Падобныя адносіны Фешына да пачынаючых былі абумоўлены тым, што як прызнавалі самі вучні, узровень іх падрыхтоўкі быў часам "ніякі" [7].

Асаблівую ўвагу Фешын надаваў працы над малюнкам з натуры. Вялікі

уплыў на вучняў аказвала праца самога настаўніка над вучэбнай пастаноўкай. Ён даволі часта з'яўляўся ў майстэрні з усімі і маляваў побач з навучэнцамі. Часцей за ўсё менавіта з гэтага М.Фешын пачынаў сваё знаёмства з новым папаўненнем школы [8]. Пры маляванні ён выбіраў самыя складаныя ракурсы і на працягу першай гадзіны моўчкі працаваў над натурай. Нярэдка Фешын ставіў мадэль на фоне вялікага палатна, сшытага з некалькіх палос, "ствараючы дзіўнае лёгкае жывапіснае асяроддзе для натуры." У якасці найбольш складанай задачы размяшчаў натуру супраць святла, на фоне акна. Ад мадэлі Мікалай Фешын не патрабаваў празмернай напружанасці, прапаноўваў адчуваць сябе натуральна і вольна [9]. Вучні прыгадвалі, што Фешын ставіў мадэль пры зачыненых дзвярах класа, толькі ў прысутнасці дзяжурнага вучня ці вартаўніка. Такая традыцыя, ім заведзеная, пэўны час існавала ў Казанскай мастацкай школе.

Фешын змяніў характар патрабаванняў да класных і самастойных прац вучняў. Неаднойчы ён нагадваў сваім выхаванцам, што для таго, каб нешта адлюстраваць, неабходна гэта бачыць, а для таго, каб убачыць, неабходна першапачаткова ведаць, што ты павінен убачыць. Таму Фешын патрабаваў ад сваіх вучняў выканання накідаў і малюнкаў з анатамічных работ Гудона, сур'ёзных ведаў у галіне анатоміі. Асабліва важнымі ў малюнку Мікалай Фешын лічыў дакладнасць прапорцый і трываласць канструкцыі. Падабенства з натурай ён вызначаў для пачынаючых, як "праблему будучыні". "Калі дзіця малюе чалавека, яно робіць яго заўжды падобным, ва ўсялякім выпадку знаёмыя яго пазнаюць і сцвярджаюць гэта. Але ў яго ўсё крыва, а аб чэрапе, безумоўна, ніякага паняцця. А Вы зрабіце партрэт не падобным, але каб усё было пабудавана ў прапорцыях..." Вялікую ўвагу Фешын надаваў малюнку рук, заўжды паказваў, як яго завяршыць [3]. Будучы па характару сціплым чалавекам, Мікалай Фешын быў немнагаслоўны і пасля некалькіх прынцыпова важных заўваг у адрас вучнёўскай працы нярэдка браў аловак ці вугаль і дэманстраваў прыёмы працы над малюнкам. Менавіта пры Фешыне многія вучні пачалі выкарыстоўваць у малюнку вугаль і французскую паперу.

Мікалай Фешын шчыра казаў выхаванцам сваёй майстэрні, што малюнку, як і пісьменнасці можна навучыць любога, але жывапіс – удзел толькі адоранага чалавека. Нягледзячы на тое, што ў школе яго звалі "Бог жывапісу" [10] у навучанні жывапіснаму рамяству Фешын абмяжоўваўся спраўленнем памылак у падрыхтоўчым малюнку. Ён рабіў гэта бязлітасна не больш 5-7 хвілін, часцей чорнай фарбай, нават тады, калі на думку вучня праца над жывапісным палатном ішла да заканчэння. Дакладнасць малюнка вызначала для Фешына аснову любога жывапіснага твора. "Каб пісаць трэба ўмець маляваць," падкрэсліваў мастак [9]. Непасрэдна ў жывапісе Фешын дазваляў сабе толькі парады.

Сур'ёзную ўвагу Мікалай Фешын надаваў пастаноўцы нацюрмортаў. Для гэтага ім падбіраліся часцей за ўсё звычайныя бытавыя рэчы, з якіх умела ствараліся нескладаныя гарманічныя кампазіцыі. Гэта ў далейшым дазваляла больш увагі надаваць непасрэдна працы над жывапісным рашэннем нацюрморта. Нацюрморты часам ставіліся на працягу дзвюх і болей гадзін і заўсёды вылучаліся тонкім густам, былі стрыманымі па колеру ці наадварот насычанымі, з прыгожымі спалучэннямі розных матэрыялаў. Былі нават пастаноўкі са свячой, якая гарэла ўнутры вялікай скрыні, што стварала ўражанне начнога асвятлення.

Асноўнай задачай пейзажных эцюдаў М.Фешын лічыў развіццё ўважлівасці ў перадачы колеру, характэрных асаблівасцяў натуры. Невыпадкова патрабуючы хуткасці і дакладнасці ў перадачы стану прыроды Фешын папярэджваў: "Воблакі не нацюрморты, на два тыдні іх не паставіш" [11].

Найбольш дасканала Фешын тлумачыў тэхніку жывапісу. Звычайна пачынаў з прыёмаў працы пэндзлем. "Трэба пісаць пэндзлем зверху ўніз, каб твой пэндзаль дражніў" [12], – казаў мастак аднаму вучню ці абураўся працай іншага: "Ці ж так трымаюць пэндзаль? Вось як трэба, як смычок!" [7]

Неабходнасць падобных ведаў Фешын у свой час пазнаў на ўласным вопыце. У працах выхаванцаў Фешыну падабаліся шырокае і лёгкае пісьмо, смелыя сакавітыя мазкі і ў той жа час мяккасць, стрыманасць каларыту, вытанчанасць жывапіснай фактуры. Мастак не любіў гладкага жывапісу. Вучні нярэдка спрабавалі працаваць то пэндзлем, то мастыхінам, а часам і пальцам, як гэта асабліва ўдала рабіў іх настаўнік. Калі Фешыну падабаўся эцюд ці малюнак, ён пытаўся ў яго аўтара, што б той хацеў яшчэ зрабіць, чаго не хапае ў рабоце, каб сам вучань разабраўся ў далейшым ходзе працы [13].

Для жывапісу вучні Фешына пачалі выкарыстоўваць палатно, нацягнутае на падрамнік, і ўласную грунтоўку асновы з выкарыстаннем казеіну ці жэлаціну. Настаўнік падтрымліваў жаданне вучняў пісаць на палотнах вялікага памеру і ўвогуле, не ставіў заслону пошукам і эксперыментам у галіне тэхналогіі і тэхнікі. Наадварот, Мікалай Фешын дзяліўся з вучнямі ўласнымі знаходкамі ў гэтай галіне. Выхаванцы яго майстэрні пачалі працаваць з рознымі разбаўляльнікамі для алейных фарбаў, нярэдка абястлушчвалі апошнія, выціскаючы іх перад працай на паперу. Фешын заўжды пераконваў, што чым меншай колькасцю фарбаў карыстаешся, тым больш "ежы" для розуму [14]. Акрамя алейных фарбаў у майстэрні Фешына часта выкарыстоўвалі гуаш, тэмперу і пастэль.

Спробы вучняў Фешына імітаваць у жывапісе манеру свайго педагога прымушалі яго тлумачыць шкоднасць падобнага шляху. Але ў цэлым Фешын спакойна ставіўся да захаплення вучняў творчасцю таго ці іншага мастака і нават бачыў часовую карысць ў гэтым. Ён адзначаў, што з цягам часу ў кожнага з'явіцца ўласная манера, свой каларыт, ў якім праявіцца індывідуальнасць. Разам з тым Фешын імкнуўся выключыць уплывы на сваіх вучняў з боку мастакоў так званага левага накірунку, якіх было шмат сярод выкладчыкаў Казанскай мастацкай школы. "Іх не слухайце, і не паварочвайце з адзінага правільнага шляху", – гаварыў Фешын [12]. "Шкада, што яны (левыя – прым. аўтара) не могуць даць тых сур'ёзных ведаў, якія патрэбныя моладзі..." [3]. Фешын высока цаніў творчасць І.Рэпіна, В.Сярова, Мікеланджэла, Д.Веласкеса, Рэмбранта, у яго было шмат альбомаў з рэпрадукцыямі твораў гэтых мастакоў і ён часта паказваў іх вучням. Увогуле, з вучнямі ў Фешына складваліся добрыя сяброўскія адносіны. Ён запрашаў хлопцаў і дзяўчат да сябе ў майстэрню, дзе за кубкам гарбаты вяліся размовы аб мастацтве. Менавіта пад уплывам Фешына многія ў Казанскай школе пачалі цікавіцца музыкай, тэатрам, операй, літаратурай. Разам са сваімі вучнямі М.Фешын даволі часта бываў на канцэртах славутых музыкантаў Я.Кубеліка, Б.Губермана, С.Рахманінава. Усё гэта не толькі ўзбагачала далягляд вучняў, але і прадстаўляла ім новыя шляхі для прафесійнага ўдасканалення.

У створаных, у студзені 1919 года на базе мастацкай школы, Казанскіх дзяржаўных мастацкіх майстэрнях Мікалай Фешын узначальвае жывапісную майстэрню, і у гэтым жа годзе прадстаўляе праект новай праграмы навучання. Гэты праект – адзінае больш-менш сістэматызаванае выкладанне педагагічных поглядаў і прынцыпаў мастака. Фешын лічыць, што школа павінна ўключаць пачатковы этап, дзе вучань спрабуе свае сілы, а настаўнік "разбіраецца ў хаосе паступіўшага матэрыялу", непасрэдна школу, дзе засвойваюцца тыя ці іншыя тэхнічныя веды і майстэрні, якія завяршаюць працэс адукацыі мастака. "Найвялікшае зло я бачу ў навязванні штучнай формы пачынаючаму, дзе пад настойлівую і самазадаволеную ўказку настаўніка ён

хавае ў сабе самае каштоўнае – гэта маладое некранутае ўяўленне. Як бы ні быў адораны кіраўнік, ён не ў стане зразумець кожнага, калі імкнецца весці ўсіх па адной і той жа дарозе" [15]. Мікалай Фешын лічыў, што вучань павінен спачатку выказваць без перашкод сваё "індывідуальнае крэда" і толькі потым асвойваць усю шматлікую колькасць форм мастацтва. У сувязі з гэтым мастак адмаўляў неабходнасць праграмы для першага года навучання, прапануючы вучням выконваць кампазіцыі на вольную тэму, кіруючыся ўласным уяўленнем [15]. Мастацкія матэрыялы, якія прапануе выкарыстоўваць Фешын на гэтым этапе самыя розныя, але "простыя": гліна, вугаль, крэйда і акварэль. Дадатковым матэрыялам можа быць "усё, што прыдумае сам вучань". Фешын адзначаў, што пачынаючы не павінен карыстацца ніякімі штучнымі дапаможнікамі і "чэрпаць" форму толькі ў прыроды. "Гіпсы неабходна проста разбіць, як абсалютна зжыўшыя сябе", –заяўляў Фешын і ў той самы час дапускаў працу над імі на элементарнай стадыі, на самы кароткі тэрмін пры вывучэнні святлацені. Прыкметнай з'яўляецца пазіцыя Фешына ў адносінах да адзнакі вучнёўскіх работ. У традыцыйных выстаўках-праглядах ён бачыць вялікую неабходнасць у прысутнасці вучняў. "Крытыка пры зачыненых дзвярах нічому не вучыць", – сцвярджае мастак. На наступным этапе "элементарнага навучання" Фешын указвае на неабходнасць авалодвання ўсімі спосабамі "якія толькі ёсць у тэхніцы пластычных мастацтваў". Аўтар праграмы асабліва падкрэслівае, што кожны жывапісец, архітэктар, скульптар, мастак прыкладнога мастацтва, які жадае заняцца педагагічнай дзейнасцю павінен у аднолькавай ступені валодаць кампазіцыяй і малюнкам. "Вось чаму на пастаноўку элементарнага навучання (школа ў прамым сэнсе слова) і неабходна звярнуць самую сур'ёзную ўвагу". (...) Толькі тут вучань можа набыць мастацка-тэхнічны багаж, які забяспечыць поспех яго будучай працы" (...).

Мікалай Фешын выступаў за навучанне ў майстэрнях, дзе справа даручана спецыялістам, якія адказваюць за ўсё. "Класнае размеркаванне заняткаў не дае вучню вольна карыстацца часам і вольна выбіраць праграму работ. Таму пажадана, каб час у які вучань закончыў сваю тэхнічную адукацыю (маецца на ўвазе навучанне рамяству – прым. аўтара) і перайшоў на тую ці іншую спецыяльную галіну мастацтва, не перавышаў чатырох гадоў". Нагружаць гэтыя чатыры гады чым-небудзь не маючым прамых адносін да чыстага мастацтва Фешын лічыў недапушчальным. "На ўсё не хопіць ні сіл ні часу" [15]. На думку аўтара праекта поспех кожнай майстэрні галоўным чынам залежыць ад умоў, што прадстаўлены вучням. "Аб гэтым трэба паклапаціцца ў першую чаргу, як і аб неабходнай колькасці індывідуальных невялікіх майстэрняў для самастойнай працы вучняў, камандзіровак па схільнасцям, паколькі "для таго каб быць мастаком трэба бачыць і бачыць..." Фешын перакананы, што майстэрні павінны насіць, як бы "прыватны характар", дзе адміністрацыя дае памяшканне і сродкі, а ва ўсім астатнім палагаецца на погляды і адказнасць кіраўніка. У той жа час "не прадэманстраваўшыя поспехаў на працягу года на наступны этап навучання не дапускаюцца", – завяршае Мікалай Фешын.

У 1922 годзе М.Фешына запрашаюць выкладаць у Нью-Йоркскую Акадэмію мастацтваў пры Grand Central Gallery, і ў 1923 годзе ён пакідае Казанскую мастацкую школу і з'язджае ў Амерыку. Педагагічная практыка на чужыне расчароўвае мастака. Фешын сутыкаецца з незразумелымі мастацкімі традыцыямі і густамі. Яго здзіўляе, што вучні амерыканскай акадэміі задавальняюцца толькі знешнімі эфектамі ў жывапісе. "Яны патрабуюць каб я браў пэндзаль і папраўляў іх, затым бяруць эцюды і да іх больш не датыкаюцца, падпісаўшы ўласнымі прозвішчамі" [16]. На пэўны тэрмін ён спыняе выкладчыцкую дзейнасць, падарожнічае па Амерыцы, але ў 1946 годзе зноў набірае вучняў і пачынае іх вучыць.

Мікалай Фешын, будучы па прыродзе нястомным і працавітым, сакрэт далейшага поспеху сваіх вучняў бачыў менавіта ў гэтых рысах. "Мастацтва патрабуе ад чалавека ўсяго і на ўсё жыццё. Не думайце, што Вы ўжо мастак. Вы стаіце на адной прыступцы, а лесвіца высокая – да самага неба. Мэта жыцця – гэта творчая праца і ўдасканаленне ў мастацтве, перадача ўсёй прыгажосці рэальнага свету і праца, праца, праца..." [12].

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Николай Иванович Фешин.*** Документы, письма, воспоминания о художнике. Л.: Художник РСФСР, 1975. - 170 с.
2. ***Ростовцев Н.Н.*** История методов обучения рисованию. М., 1992.-239 с.
3. ***Архіў Музея выяўленчага мастацтва Татарстана.*** Фонд М.И.Фешына. Воп.2, спр.Ф-І. Успаміны Ф.А. Мадорава.
4. ***Архіў МВМ Татарстана.*** Фонд М.І.Фешына. Воп.2, спр.Ф-2. Успаміны Н.М.Ніканава.
5. ***Архіў МВМ Татарстана.*** Фонд М.І.Фешына. Воп.2, спр.25. Успаміны К.К.Чэбатарова.
6. ***Архіў МВМ Татарстана.*** Фонд М.І.Фешына. Воп. І, спр.Ф-23. Успаміны Д.І.Разанскай.
7. ***Архіў Дзяржаўнага Музея Татарстана.*** Фонд П.М.Дудьскага, інв. №120181-174. З успамінаў П.І.Котава.
8. ***Руднев В.В.*** Александр Михайлович Соловьёв. М., 1970. С. 13-17.
9. ***Архіў МВМ Татарстана.*** Фонд М.І.Фешына. Воп.2, спр. Ф-14. Успаміны Я.Ф.Ошустовіч.
10. ***Попов А.*** Воспоминания и размышления о театре. М., 1963. С.38-39.
11. ***Архіў МВМ Татарстана.*** Фонд М.І.Фешына. Воп.2, спр. Ф-13. Успаміны В.П.Вакуловіч.
12. ***Архіў МВМ Татарстана.*** Фонд М.І.Фешына. Воп. 2, спр. Ф-20. Успаміны П.А.Радзімава.
13. ***Архіў МВМ Татарстана.*** Фонд М.І.Фешына. Воп.2, спр. Ф-11. Успаміны Т.А.Паповай.
14. ***Архіў ДМТ.*** Фонд П.М.Дульскага. Інв.№120181-3559. Н.І.Фешын. Аб тэхніцы і тэхналогіі (рукапіс).
15. ***Цэнтральны Дзяржаўны Архіў Татарстана.*** Фонд 1431, воп.1, спр.27. С.78-81.
16. ***Воронов В.*** Судьба Николая Фешина // Огонёк, 1964. № 29. С. 17.


## *SUMMARY*


*Some peculiarities of pedagogical principles and methods of wellkown russian and american painter Nikolay Feshin are investigated.*